***В. І. Астапчык***
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

# АСАБЛІВАСЦІ НАТАТКІ ЯК ЖАНРУ ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА СТЫЛЮ

Адной з актуальных задач сучаснай школы з'яўляецца неабходнасць у падрыхтоўцы вучняў да вусных і пісьмовых паведамленняў розных тыпаў. Сістэма працы па навучанні школьнікаў традыцыйным відам сачыненняў дастаткова поўна распрацавана (В. А. Дабрамыслаў, Т. А. Ладыжанская, Л. П. Падгайскі, Ю. С. Пічугоў, М. Г. Яленскі і інш.), менш увагі нададзена (асабліва ў беларускай метадычнай навуцы) пытанню навучання школьнікаў пабудове выказванняў у пэўным жанры, у тым ліку і ў жанры нататкі. Прычына гэтага заключаецца ў тым, што нататка як жанр школьнага сачынення была ўведзена ў праграму па беларускай мове параўнальна нядаўна, акрамя таго на яго здаўна прыкметна ўплывае публіцыстыка.

У сістэме стыляў сучаснай беларускай літаратурнай мовы публіцыстычны стыль уяўляе сабой такую функцыянальную разнавіднасць, якая самым непасрэдным чынам звязана з жыццём грамадства, дэтэрмінавана сацыяльным прызначэннем сродкаў масавай камунікацыі. Публіцыстычны тэкст любой тэматыкі накіраваны да адрасата з розным жыццёвым вопытам, прафесійнымі, інтэлектуальнымі і духоўнымі запатрабаваннямі. Галоўныя асаблівасці публіцыстычнага стылю найбольш ярка праяўляюцца ў мове газеты — аднаго з важнейшых сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды.

Сярод жанраў публіцыстычнага стылю, якія вывучаюцца ў агульнаадукацыйных установах, сучаснай вучэбнай праграмай па беларускай мове навучанне напісанню нататкі прадугледжана ў 7, 9, 10 класах. Эфектыўнасць стварэння школьнікамі такіх тэкстаў залежыць ад усведамлення імі зместавых, кампазіцыйных і лінгвастылістычных асаблівасцей нататкі і ад сістэмы працы, накіраванай на навучанне правільна будаваць выказванне ў адпаведным жанры. Вучэбная праграма прапануе вывучэнне нататкі ў *інфармацыйным* жанры, мэта якога адлюстроўваць канкрэтны **факт,** паведаміць *што, дзе, калі адбылося або павінна адбыцца* [6].

Праз усе гады існавання перыядычнага друку нататка з'яўлялася самым пашыраным інфармацыйным жанрам і з нязменным поспехам выконвала сваю спецыфічную функцыю — *аператыўна, дакладна і сцісла* паведамляла аб новых фактах, падзеях і з'явах рэчаіснасці.

Падставай для напісання і апублікавання нататкі з'яўляецца *надзённасць*, *навізна*, *яркасць рэдкасць* факта, што вылучае яго са штодзённай плыні жыцця. Нататка не прэтэндуе на глыбокае даследаванне, супастаўленне або абагульненне фактаў — гэта свежы факт без разважанняў [2].

Як адзначалася вышэй, нататка адносіцца да інфармацыйнага жанру, які адрозніваецца адмысловым прыёмам перадачы інфармацыі: «тэлеграфным стылям» у кантэксце рэальнага часу. Таму асноўнымі характарыстыкамі нататкі з'яўляюцца *аператыўнасць, ёмістасць, сцісласць, навізна інфармацыі, сацыяльная значнасць*.

Даследчыкі Б. В. Стральцоў, А. М. Грыніна-Зямскова, Г. С. Мельнік, А. К. Бабкоў адзначаюць празмерную важнасць для нататкі такой характарыстыкі як *аператыўнасць* паведамлення. У тэксце нататкі паведамляецца час здзяйснення падзеі з дапамогай слоў «сёння», «учора», «учора вечарам» і г. д.

Сярод вышэйназваных характарыстык Г. С. Мельнік вызначае галоўнай *навізну*: тэрміновае, цікавае, займальнае паведамленне аб новай падзеі. Навіна павінна быць досыць значнай і дынамічнай, каб прыцягнуць увагу. Класічнымі элементамі навіны лічацца:

- своечасовасць, адчуванне важнасці аператыўнай падачы;
- блізкасць, зразумеласць для пэўнай аўдыторыі, якасць рэлевантнасці;
- агульназначнасць, важнасць для ўсіх альбо магчымы «эмацыйны» штуршок пры паведамленні незвычайнага здарэння;
- канфліктнасць, адмысловая яркасць, незвычайнасць падзеі;
- сувязь з вядомым чалавекам;
- цікавасць, якая не пакіне чытача абыякавым [4].

Пацвярджаючы думку Б. В. Стральцова А. А. Цяртычны, , адзначае, што галоўнае для нататкі — менавіта *сціслы выклад*, «сігналізаванне» аб існаванні (або адсутнасці), асноўных рысах нейкай з'явы, падзеі, чалавека, праблемы. Паведамленне павінна быць зроблена ў *кароткай форме*, займаць мала месца на газетнай паласе, але чытачу сказаць многае. Прычым гэта павінна выступаць для аўдыторыі як "навіна", г. зн. патэнцыяльная інфармацыя, якая перавышае тое, што ўжо вядома [7].

Акрамя таго, нататка раскрывае *логіку факта*. Дзякуючы гэтаму, чытач атрымлівае стымул для асэнсавання паведамлення. На гэты бок працы з фактам звяртаў увагу А. М. Горкі, які неаднаразова падкрэсліваў:«... трэба ўмець выбіраць з факта сэнс».

Даследчык В. В. Варашылаў дадае да асноўных характарыстак нататкі такія, як *сцісласць*, *аператыўнасць*, *рэлевантнасць* (адпаведнасць інтарэсам аўдыторыі), *фактычная дакладнасць*, *дэкадыруемасць* (зразумеласць для аўдыторыі сутнасці паведамлення), *ачышчанасць* сутнаснай інфармацыі ад «шумоў» (дадатковых звестак, дэталяў і падрабязнасцей, якія адцягваюць увагу ад сутнасці тэмы) [1].

У якасці асноўных характарыстак нататкі А. М. Цікоцкі вызначае *гранічную сцісласць, лаканічнасць пры значнай інфармацыйнай насычанасці, абмежаванасць ужывання вобразна-выразных адзінак, адсутнасць сродкаў выражэння адносін аўтара да таго, што апісваецца* [8].

Кожны жанр — гэта вызначаны спосаб арганізацыі маўлення, пэўная маўленчая форма, у якой вялікую ролю адыгрывае вобраз аўтара. У публіцыстыцы «*аўтарскае я»* журналіста — гэта характар яго стаўлення да рэчаіснасці (непасрэднае апісанне, адзнака, паведамленне і г. д.). У дачыненні да кожнага жанру «аўтарскае я» (вобраз аўтара) мае розную форму, характар. *Вельмі слаба «аўтарскае я» выяўлена ў нататцы.* Для яе стылю характэрна *накіраванасць на паведамленне*. Галоўнае — праўдзіва паведаміць сутнасць інфармацыі, лаканічна расказаць пра факт, падзею без каментарыяў і вывадаў [5]. У сваёй працы С. М. Гурэвіч звяртае ўвагу на тое, што «роля аўтара нататкі абмяжоўваецца паведамленнем інфармацыі і толькі часова пазначаецца яго подпісам» [3, с. 130].

У стылістычным плане нататка прынцыпова пазбаўлена прыкмет індывідуальнага стылю, суб'ектыўнасці падыходу і г. д.; гэта — сухі, абмежавана інфарматыўны аб'ектыўны выклад фактаў, пазбаўлены ацэначнасці. Як правіла, нататка пачынаецца непасрэдна з інфармацыйнай падставы, пасля чаго ідзе пашырэнне — канкрэтызацыя часу, месца, абставін падзеі і г. д.

Па словах Б. В. Стральцова, часта аўтарскія адносіны да факта заключаюцца ў эмацыянальным ладзе нататкі. Экспрэсіўная афарбоўка паведамлення яскрава перадае ацэнку, якую журналіст дае ўбачанаму і вылучанаму з іншых «кавалачкаў жыцця». Адсюль і экспрэсіўны тон газетнага паведамлення, прычым гэта *экспрэсіўнасць стрыманая, якая не мае нічога агульнага з напышлівай дэкларатыўнасцю*. Такая нататка не толькі прапануе чытачу факт для асэнсавання, але і ўздзейнічае на яго эмоцыі. Эмацыянальны лад нататкі залежыць ад характару факта, на якім спыніў сваю ўвагу аўтар. У адным выпадку факт выклікае захапленне, у другім — добры гумар, у трэцім — настройвае на лірычны лад і г. д. Адпаведна з настроем у пэўным экспрэсіўным ключы даецца ацэнка факта, робіцца яго аналіз.

Такім чынам, абагульняючы вышэйпералічанае, прыходзім да высновы, што *аператыўнасць* і *лаканізм* выкладу — не самамэта пры падрыхтоўцы нататкі. Галоўнае — паведаміць аб фактах, якія ўяўляюць цікавасць для чытача. У якасці асноўных характарыстык нататкі можна вылучыць: *блізкасць тэмы навіны* (калі «чужое» пазнаецца і ўспрымаецца як частка ўласнага жыцця); *праўдзівасць*, *своечасовасць (аператыўнасць) здарэння або водгуку на яго*; *маштабнасць падзеі* (адчуванне, што гэта —«навіна для ўсіх»), *рэлевантнасць, гранічная сцісласць, канфліктнасць*, «*эмацыйны штуршок»* (паведамленне аб экстраардынарным, трагічным і інш.).

**Спіс крыніц**


1. *Ворошилов, В. В.* Журналистика / В. В. Ворошилов. — СПб. : Михайлов В. А., 2004. — 127 с.
2. *Гринина-Зямскова, А. М.* Сочинения в газетных жанрах. 5—9 классы / А. М. Гринина-Зямскова. — Волгоград : Учитель, 2006. — 119 с.
3. *Гуревич, С. М.* Гомер газеты / С. М. Гуревич. — М. : Аспект пресс, 2002. — 191 с.
4. Основы творческой деятельности журналиста : ч. 2 Хрестоматия / Г. С. Мельник [и др.]. — СПб. : Питер : Питер принт, 2004. — 271с.
5. *Солганик, Г. Я.* Стилистика текста / Г. Я. Солганик. — 2-е изд. — М. : Флинта: Наука, 2000. — 252 с.
6. *Стральцоў, Б. В.* Метад і жанр / Б. В. Стральцоў. — Мн. : БДУ, 2002. — 116 с.
7. *Тертычный, А. А.* Жанры периодической печати / А. А. Тертычный. — 2-е изд. , испр. и доп. — М. : Аспект пресс, 2002. — 319 с.
8. *Цікоцкі, А. М.* Стылістыка газетных жанраў : дапам. для вузаў / А. М. Цікоцкі. — Мн. : БДУ, 2003. — 24 с.


Материал поступил в редакцию 12.04.2011.

***А. М. Гацко***
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ІНТЭРАКЦЫЯ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ МОЎНАЙ АСОБЫ

У сучаснай адукацыйнай прасторы, у адпаведнасці з арыентацыяй грамадства на гуманізацыю ўсіх сфер чалавечай жыццядзейнасці, вядзецца інтэнсіўны пошук новых шляхоў, якія адпавядаюць духу дэмакратызацыі, спосабам арганізацыі і рэарганізацыі міжасобасных адносін. У гэтым пошуку адно з першых месц займаюць праблемы ўзаемадзеяння ў працэсе суразмоўніцтва — своеасаблівай мэтанакіраванай лабараторыі па выпрацоўцы спецыяльных сродкаў маўленчага ўзаемадзеяння.

На першы план выходзіць функцыянальнасць, рацыянальнае выкарыстанне лінгвістычных ведаў для рэальнага суразмоўніцтва ў разнастайных сітуацыях. У гэтай сувязі ўзрастае патрэба ў спецыялістах, якія грунтоўна валодаюць роднай мовай як сродкам суразмоўніцтва і метадычнымі ўменнямі арганізацыі вучэбнага ўзаемадзеяння. Цэнтральным паняццем у камунікатыўна-арыентаваным навучанні мове з'яўляецца сацыяльнае ўзаемадзеянне (інтэракцыя) паміж выкладчыкам і студэнтамі ў межах аўдыторных заняткаў, якое разглядаецца як камунікатыўная падзея — дыскурс. Для паспяховай пабудовы гарманічнага дыялога студэнтам неабходна навучыцца аперыраваць ведамі аб сацыяльнай і індывідуальнай інтэракцыі, захоўваць нормы паводзін у суразмоўніцтве. Падрыхтоўка сучаснага спецыяліста ў галіне моўнай адукацыі мае на ўвазе здольнасць ажыццяўлення ім усіх відаў маўленчай дзейнасці. Адбор зместу для фарміравання асобы сучаснага настаўніка адрозніваецца шэрагам асаблівасцей: матэрыялы павінны быць аўтэнтычнымі і рэлевантнымі для студэнтаў, спрыяць павышэнню іх інтэлекту, а таксама несці элементы нацыянальнай культуры. Працуючы ў інтэрактыўнай